*Дзяніс Дук*

# Аб прыналежнасці некаторых груп полацкай кафлі з геральдычнымі матывамі

Геральдычная тэматыка складае асобную групу арнаментыкі полацкай кафлі. Археалагічныя даследаванні ў Полацку за апошнія дзесяцігоддзі значна ўзбагацілі калекцыю «геральдычнай» кафлі. Некаторыя матэрыялы па полацкай кафлі з фондаў Полацкага гістарычна-культурнага музея-запаведніка публікуюцца ўпершыню.

Ужыванне кафлі з гербамі ў Полацку адзначаецца з канца XVI стагоддзя, што адбылося амаль на стагоддзе пазней, чым у цэлым па Еўропе [1], і на паўстагоддзе пазней [2] у параўнанні з беларускім кафлярствам. Гэта можа тлумачыцца наступствамі Лівонскай вайны, падчас якой развіццё рамесніцтва было перапынена больш чым на паўтара дзесяцігоддзя. Тым не менш, у XVII стагоддзі геральдычныя матывы знайшлі вельмі шырокі ўжытак у аздабленні печаў грамадзянскіх і культавых пабудоў.

Па сваёй прыналежнасці ўсе гербы падзяляюцца на агульнадзяржаўныя і асабістыя гербы свецкіх ці духоўных феадалаў. Да першай групы належаць пласціны з выявамі герба «Пагоня» і, магчыма, некаторыя варыянты з выяваў сокала ў геральдычнай паставе [3].

Найбольш шматлікая і разнастайная група кафлі выраблялася ў Полацку па заказу прыватных асоб. Большасць яе дайшла да нас у выглядзе невялікіх фрагментаў [4], некаторыя з іх датаваныя [5]. На кафлі звычайна месціліся гербы сярэдняй і заможнай шляхты, а таксама прадстаўнікоў буйных княжацкіх і магнацкіх родаў,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал.1. Кафля з выявай гербаў роду Кішак XVII ст.

такіх, як Друцкія-Сакалінскія, Дарагастайскія, Зяновічы, Кішкі. Найбольшую цікавасць прадстаўляе кафля з гэтак званымі састаўнымі гербамі.

На аснове супастаўлення шматлікіх фрагментаў [6] удалося зрабіць графічную рэканструкцыю знешняга выгляду кафлі з выявамі гербаў радавода Кішак. Уражваюць, па-першае, вялікія памеры вонкавай пласціны – 22,3 х 25 см (мал. 1), і, па-другое, незвычайная колькасць шматлікіх фрагментаў з аднолькавым малюнкам дэталяў, але з разнастайнай тэхнікай апрацоўкі паверхні. Так, трапляюцца тэракотавыя фрагменты гэтай кафлі, кавалкі, пакрытыя слоем ангоба без паліва і з палівай, а таксама паліваныя ронымі адценнямі зялёнага без папярэдняга ангабіравання. Уся кафля знойдзена на Верхнім замку падчас назірання за будаўнічай траншэяй у 1993 годзе.

Таўшчыня пласцінаў вар'іруецца ў залежнасці ад тыпаў апрацоўкі (0,7–1,2 см, вышыня румпы не ўстаноўлена (ні на адным з фрагментаў яна не захавалася). Вядома, што яна адступала ад края пласціны на 3,5 см і была ўзмоцнена з абодвух бакоў налепнымі валікамі гліны. Ма-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цавальныя адтуліны зафіксаваны з усіх чатырох бакоў румпы, яны праароблены драўлянай трэскай па цэнтру кожнай з чатырох старон [7].

На вонкавай паверхні пласціны месціцца выява геральдычнага шчыта германскага тыпу з чатырохчастковым дзяленнем. У правым верхнім вуглу размешчаны герб «Дамброва» (падкова з трыма крыжамі), пад ім – герб «Трубы». Злева ўверсе – герб «Ліс», ніжэй – «Косцеж», ці, па-іншаму, «Стжегомя». Шчыт увенчаны рыцарскім шлемам з каронай і птушыным крылом, працятым стралой. Малая колькасць шчылін на шлеме сведчыць аб даўняй радавітасці ўладальніка. Вакол шчыта месціцца намёт у выглядзе парасткаў. Па ўсяму люстэрку кафлі – над шчытом, па баках намёта і пад ім – пачаргова адціснуты лацінскія літары «I K W P H P W X L P S». Шырокая двухуступчатая рамка аздоблена рэльефным стужкавым арнаментам з рапортам (тры кропкі-рыска). Акрамя стандартнай абрэвіятуры «W X L», што азначае «Wielkie Xiestwo Litewskie», астатнія літары ёсць пачатковымі ад імя ўладальніка герба і яго пасады.

Дакладна такі ж шчыт з чатырохчастковым дзяленнем і аднолькавымі гербамі вядомы па пячатках славутага магнацкага роду Кішак [8]. На адной з пячатак 1616 года Станіслава Кішкі над шчытом размешчана выява епіскапскай шапкі, што сведчыць аб пасадзе ўладальніка (біскуп Жмудскі). На пячатцы яго брата, падскарбія літоўскага Мікалая Кішкі, шчыт увенчаны шлемам і нашлемнікам з пер'ем. Адлюстраваны на полацкай кафлі герб належыць Янушу Кішку – апошняму прадстаўніку свайго роду, які памёр у 1653 годзе і не пакінуў пасля сябе нашчадкаў па мужчынскай лініі. Надпіс на лаціне расшыфроўваецца як «Ioan Kiszka Woewoda Polotskij Hetman Polny W X L Parnawskij Starosta».

Януш Кішка, чацвёрты сын Станіслава Кішкі, віцебскага ваяводы, атрымаў у 1610 годзе парнаўскае старроства, а з 1621 года ён займае пасаду полацкага ваяводы. У 1635 годзе Я.Кішка становіцца палявым гетманам, у 1646 годзе атрымаў пасаду вялікага гетмана Літоўскага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Значыць, кафля з ініцыяламі Я.С.Кішкі была зроблена ў прамежку часу, калі ён займаў пасаду палявога гетмана, г. зн. паміж 1635 і 1646 гадамі.

Цікава адзначыць той факт, што тры браты апошняга пакалення Кішак змясцілі на полі шчыта аднолькавыя гербы. Уверсе, у левым вуглу шчыта, размешчаны асабісты герб Кішак – «Дамброва»; пад ім – герб «Трубы» Анны Радзівілаўны, бабкі па бацькоўскай лініі Януша Кішкі і яго братоў, злева ўверсе – герб «Ліс» маці Эльжбеты Сапежанкі, а пад ім старажытны герб Хадкевічаў – «Касцеж». Адзначым, што ніводнае з правіл геральдыкі, пра якія распавядаюць польскія аўтары XVIII стагоддзя, у дадзеным выпадку не дзейнічае. На шчыце з чатырохчастковым дзяленнем гербы змяшчаліся наступным чынам: у галоўнай частцы шчыта (справа ўверсе) – родавы герб уладальніка, злева ўнізе – герб жонкі дзеда. Далей, згодна з Ю.Ячблаunion[9], злева ўверсе павінен размяшчацца герб маці, справа ўнізе – герб дзеда; паводле В.Веландка [10], адпаведна гербы дзеда і маці.

Відавочна, што складальнікі герба (а гэта мог быць любы з братоў) кіраваліся імкненнем сабраць на поле шчыта гербы сваіх найбольш радавітых продкаў і пазбегнуць, такім чынам, паўтору геральдычных матываў. У беларускай геральдыцы вядомы прыклады, калі гербы вельмі шануемых у родзе продкаў уключаліся ў клейноты нават некалькіх пакаленняў [11]. Па гэтай прычыне сюды трапіў радавы герб Хадкевічаў – Анна Хадкевіч была бабкай па мацярынскай лініі Януша Кішкі [12]. Сваяцтва Кішак і Хадкевічаў працягвалася здаўна – Барбара Хадкевіч была другой жонкай Мікалая Пятровіча Кішкі, ваяводы падляшскага, іх нашчадкі ўтварылі другую галіну роду Кішак [13].

Такім чынам, герб Я.Кішкі састаўлены па прынцыпу: уверсе радавы герб і герб маці, унізе – гербы бабак па бацькоўскай і мацярынскай лініях. Дакладна такі ж парадак размяшчэння гербаў на полі шчыта адзначаны на заслаўскай кафлі, што належала Глябовічам [14]. Гэтае супадзенне цяжка аднесці да выпадковага. У беларускай і польскай геральдыцы вядомы прыклады адыходу ад пры-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нятых канонаў [15]. Але ў дадзеным выпадку мае месца не просты адыход – пры састаўленні гербаў радавода Глябовічаў і Кішак іх уладальнікі карысталіся традыцыяй, якая адрознівалася ад прынятай у Польшчы. Папярэдне можна адзначыць, што гэтай традыцыяй як асноўнай прадстаўнікі магнатэрыі карысталіся пры састаўленні гербаў па меншай меры ў Полацкім ваяводстве.

Падчас раскопак у двары былога Кадэцкага корпуса намі знойдзены невялікі фрагмент «гербавай» кафлі, якая належала старажытнаму роду князёў Друцкіх. Прадстаўнікі буйной галіны гэтага роду – Друцкія-Сакалінскія – у свой час займалі высокія пасады ў Полацку і Полацкім ваяводстве.

Уцалела няпоўная выява шчыта з чатырохчастковым дзяленнем. Шчыт вянчае рыцарскі шлем з княскай каронай (мал.2). У правым верхнім вуглу змешчаны ўласны герб Друцкіх – меч паміж чатырма паўмесяцамі, звернутымі рагамі адзін да аднаго. Каб вызначыць імя ўладальніка неабходна даведацца аб прыналежнасці ўсіх астатніх гербаў. Дзеля гэтага паспрабуем узяць за аснову традыцыю, якой карысталіся складальінкі гербаў ГлябовічаўКішак.

Вынікае, што гэтая пласціна належала князю Крыштофу Друцкаму-Сакалінскаму, які з 1625 года займаў пасаду полацкага кашталяна. Яго бацька, князь Міхаіл Міхайлавіч, ваявода полацкі, меў дзвюх жонак. Першая жонка – Раіна Корсак – была бясплодная, другая – Анна Пяноўская – была маці Крыштофа Міхаіла [16]. Дзед Крыштофа Міхаіла па лініі маці – Якуб Пяноўскі, уладальнік маёнтка Паўле, быў жанаты на Алене Лукомскай, прадстаўніцы княжацкага роду герба «Рох зменены» [17]. Няпоўная выява гэтага герба (з-за пашкоджанасці пласціны не бачны тры бэлькі рознай даўжыні) адлюстравана ў левым ніжнім вуглу шчыта (лілея з крыжам). У правым ніжнім вуглу змяшчаецца герб «Шэнява» бабкі Крыштофа Міхаіла па мужчынскай лініі Анны Рагозы (на кафлі захаваўся фрагментарна).

Герб, змешчаны ў левым верхнім вуглу шчыта, павінен належаць маці Крыштофа Міхаіла – Анне Пяноўскай.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сучасны стан даследаванняў не дазваляе вызначыць радавы герб Пяноўскіх, можна меркаваць па выяве, што ім мог быць герб «Боньча» ці «Аднарог».

Князь Крыштоф Міхаіл займаў пасаду полацкага кашталяна з 1625 года да сваёй смерці ў 1639 годзе. Час вырабу кафлі можна акрэсліць дзвюма датамі – паміж 1625 і 1639 гадамі.

Па вызначэнню Н.Здановіч, кафля з выявай герба «Леліва» была выраблена ў самым пачатку XVII стагоддзя, не пазней 20-х гадоў [18]. Знойдзена яна падчас раскопу на вул.



Мал. 2. Пячная кафля з выявай герба Друцкіх-Сакалінскіх.

Леніна, 35. У ніжняй частцы амаль квадратнай пласціны (19 х19 см) пасярэдзіне на шчыце складанай формы месіцца герб «Леліва» (ляжачы паўмесяц з шасцікутнай зоркай над ім). Над шчытом – шлем і нашлемнік з султанамі, на фоне якіх дублюецца выява герба «Леліва». Разам са сцяннoй і кутняй кафляй былі знойдзены фрагменты гзымсавых пласцін і кафлі-каронак з аднаго пячнога набору.

Трэба адзначыць, што ў акрэслены перыяд нам невядомы ніводны прыклад выкарыстання «гербавай» кафлі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прадстаўнікамі сярэдняй шляхты. Сярод полацкай магнатэрыі гербам «Лeліва» карысталіся полацкія ваяводы Станіслаў Глябовіч (пачатак XVI стагоддзя – 1513), Ян Глябовіч (1532 – 1542), а таксама Мікалай Дарагастайскі (1576 – 1597) [19]. Хутчэй за ўсё кафля з гербам «Леліва» належыць полацкаму ваяводзе Мікалаю Мікалаевічу Дарагастайскаму (каля 1530 – 1597), які таксама займаў пасады стольніка ВКЛ і старосты ваўкавыскага і лепельскага. За адваёву Полацка і Полацкага ваяводства падчас Лівонскай вайны Стэфан Баторы, акрамя іншага, прызначыў яго камендантам полацкага замка [20].

«Геральдычная» кафля з выявай страды, накіраванай джалам угару, знойдзена Н.Хадановіч у развале печы падчас раскопак ля дзіцячай мастацкай школы і ў шурфе каля Лютэранскай кірхі [21]. Усе пласціны з аднолькавым малюнкам, але розныя па памерах, большасць з іх тэракотавыя, але ёсць і зялёнапаліваныя фрагменты. Па кутах прамавугольнай пласціны бачны літары: «I», «S», «C», «P». Па аналогіі з пласцінамі, знойдзенымі разам, кафля папярэдне датавалася першай паловай – сярэдзінай XVII стагоддзя [22].

Герб, адлюстраваны на пласціне, належаў старадаўняму полацкаму роду Селяваў. Гэты шляхецкі род вядомы з XVI стагоддзя, калі Іван Селява меў справы са сваім братам Багданам Селявічам у 1533 годзе [23]. У XVII стагоддзі захаваліся звесткі пра некаторых прадстаўнікоў роду Селяваў, самы вядомы з якіх быў Антоні, арцыбіскуп полацкі (звесткі пад 1625 і 1632 гады). Звычайна першыя дзве літары з'яўляюцца абрэвіятурай пачатковай назвы імя і прозвішча ўладальніка герба. На сённяшні дзень вядомы Ян Селява, падчашы полацкі, які згадваецца ў 1674 годзе [24]. Менавіта яго ініцыялы змешчаны па кутах уверсе пласціны кафлі і расшыфроўваюцца як «Ioan Sielawa». Астатнія літары сведчаць аб пасадзе ўладара і, згодна з пісьмовым паведамленнем, павінны змяшчаць: «Podczashy Polotski», але справа ў тым, што функцыі пасады падчашага і чашніка ў XVII стагоддзі былі чыста намінальныя і вызначалі шляхецкую годнасць,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

таму, верагодна, кафля была створана пасля таго, калі Ян Селява заняў пасаду чашніка. Такім чынам, поўны тэкст зашыфраванага паведамлення неабходна чытаць: «Ioan Sielawa Czashnik Polotski».

Невялікая колькасць гістарычных звестак пра дзейнасць гэтай асобы дазваляе толькі прыблізна акрэсліць час стварэння серыі кафлі з гербам «Селява». Зроблена яна была дзесьці напрыканцы XVII стагоддзя, а ў адзін набор з пячной кафляй з выявай букета ў вазе (першая палова – сярэдзіна XVII стагоддзя) магла трапіць пасля перабудовы печы.



Мал. 3. Рэканструкцыя гзымсавай кафлі з расліннымі матывамі.

На аснове наяўнага матэрыялу праведзена графічная рэканструкцыя знешняга выгляду «геральдычнай» гзымсавай кафлі (мал. 3) [25]. Вонкавая старана пласціны двухчастковая, малюнак падзелены па гарызанталі на верхні плоскі і ніжні прафіляваны кампазіцыйны рад.

Ніжні аздоблены раслінным арнаментыкай малюнак верхняй часткі складаюць выявы двух звернутых адзін да аднаго фантастычных жывёл, які трымаюць герб «Дэшпат». Анімалістычны сюжэт быў вельмі распаўсюджаны ў геральдыцы (жывёлы-шчытатрымальнікі) і найчасцей ужываўся ў дэкоры гзымсаў печаў [26].

Амаль дакладны аналаг полацкай кафлі знойдзены ў Віцебску (датуецца першай паловай XVII стагоддзя) [27]. Такое падабенства нельга адносіць да выпадковага. Усё становіцца зразумелым, калі ўлічыць, што «Дэшпат» ці «Сястрынец» быў радавым гербам Зяновічаў, якія ў адзначаны пе-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рыяд займалі розныя пасады ў Полацку і Віцебску [28].

Паходжанне роду звязана з сербскім дэшпатам (намес нікам правінцыі) Зянонам Братошай (каля 1380). Ад яго сына Зяновія пазней утварылася радавое прозвішча [29]. Ад двух сыноў Юрыя Іванавіча (каля 1450 – пасля 1516 года) – Мікалая і Міхаіла – пайшлі дзве найбольш значныя галіны роду Зяновічаў. Мікалай Багуслаў, славуты палкоўнік, які загінуў падчас бітвы з туркамі пад Хоцімам, прыходзіўся праўнукам Мікалаю Юр'евічу. У ВКЛ ён займаў пасады чачэрскага і прапойскага старосты, а з 1618 па 1621 год быў кашталянам полацкім. Ян Янавіч, падстолі літоўскі, унук Міхаіла Юр'евіча, з 1594 па 1614 год служыў кашталянам у Віцебску [30]. З гэтага вынікае, што гзымсавая кафля з радавым гербам Зяновічаў былі зроблены ў час, калі Мікалай Багуслаў і Ян




Мал. 4. Рэканструкцыя «геральдычнай» гзымсавай кафлі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Янавіч займалі пасады кашталянаў у Полацку і Віцебску, адпаведна паміж 1618–1621 і 1594–1614 гадамі.

Паясковай кафлі ў Полацку знойдзена вельмі мала [31]. На адной цэлай пласціне змешчана выява герба «Радван» у акружэнні жывёл – ільва і аленя [32] (мал.4). Шчыт перададзены вельмі ўмоўна. Шлем і намёт адсутнічаюць, таму карона надзета непасрэдна на «шчыт». Вакол кароны чытаюцца літары «D» і «S». Выява перададзена невысокім, аднолькавым па вышыні рэльефам, з усёй кампазіцыі дакладна перададзены толькі ўласна герб, карона і ініцыялы ўладальніка.

Кафля пакрыта зялёнай палівай, нанесенай па слоі ангоба, па перыметру яна акаймавана контурнай рамкай. Румпа (вышынёй 8– 8,5 см ад края пласціны) з адагнутым вонку рантам шырынёй 2 см і таўшчынёй 0,8–1 см. Румпа рыфлёная (тры неглыбокія барозны), з зацёкамі зялёнай палівы, мацавальная адтуліна зроблена толькі з аднаго боку.

Герб «Радван» (харугва з крыжам) меў шмат варыяцый. У Полацкім ваяводстве ён належаў шляхетнаму роду Шчытоў [33]. Ініцыялы (пачатковыя літары «D» і «S») дазваляюць вызначыць уладальніка кафлі – Daniel Szczyt. Даніэль Шчыт займаў пасаду полацкага падсудка (памочнік земскага суддзі), акрамя гэтага згаданы як пасол сеймаў (пад 1623, 1626, 1629 гады) і дэпутат літоўскага фіскальнага трыбунала [34]. Зыходзячы з гэтых дадзеных, можна акрэсліць прыблізны час стварэння паясковай кафлі – другая чвэрць XVII стагоддзя.

З канца XVI ст. вядомы пласціны з выявай герба Мікалая Дарагастайскага, кафля з «геральдычнымі» арламі, а таксама дзяржаўны герб «Пагоня». Большасць полацкай «гербавай» кафлі была зроблена ў другой чвэрці XVII ст. (пласціны належалі Янушу Кішку, Крыштофу Друцкаму-Сакалінскаму, Даніэлю Шчыту, Мікалаю Багуславу Зяновічу). Апошнімі дзесяцігоддзямі XVII стагоддзя датуецца кафля з выявай герба Яна Селявы.

Каштоўнасць кожнай знаходкі кафлі з геральдычнымі матывамі цяжка пераацаніць. «Гербавая» кафля – гэта

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

надзейны датуючы матэрыял. Яе вывучэнне дазваляе праводзіць сінхранізацыю паміж рознымі групамі архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі і акрэсліць, такім чынам, узровень развіцця рамесніцтва ў адпаведны прамежак часу.

## Крыніцы


1. *Dabrowska M.* Kafle i piece kaflowe w Polsce do konca XVIII w./Studia i materialy z historii kultury materialnej. T.LVIII. – Wroclaw, 1987. – S.126; Dymek K., Srednowieczne i renesansowe kafle slaskie. – Wroclaw, 1995 – S.34 – 35; Tautavicius a. Vilnius pilies kokliai (XVI – XVII a.). – Vilnius, 1969.–P. 16 – 17.
2. *Пиначева Л.Г.* Хронология белорусских изразцов XVI – XVII вв.//Краткие сообщения... Ин-та археологии АН СССР, 1983, № 179.– С.74.
3. *Здановіч Н.І.* Полацкая кафля канца XVI – XVII стст.// Гістарычна-археалагічны зборнік, 1997.– № 12.–С.106 – 107.
4. Тамсама, с.106 – 107; *Паничева Л.Г.* Полоцкая архитектурно-декоративная керамика XVI – XVII вв./ /Краткие сообщения... Ин-та археологии АН СССР, 1980.–№ 160.–С.58; Яна ж. Изразцы и изразцовые печи позднесредневекового Полоцка.//Советская археология, 1981.– № 3.–С.279.
5. *Здановіч Н.І.* Полацкая кафля канца XVI – XVII стст. – С.107.
6. Захоўваюцца ў Полацкім гістарычна-культурным музеі-запаведніку (ПГКМЗ), кп-15, № 1515638, № 15636 і інш.
7. Гэтая асаблівасць тлумачыцца буйным фарматам пласціны, дадатковыя адтуліны павінны былі забяспечыць трываласць кафлі ў сцяне печы.
8. *Цітоў А.* Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі. – Мн., 1993. – С.46, 99.
9. *Jablonowski J.* Heraldika to jest Osada kleynotow rycerskich i wiadomosc znakow herbownych dotad w Polszcze nie obiasniona. – 1748,– Ee 2.
10. *Wieladko W.W.* Heraldyka czyli opisanie herbow, w jakim ktory jest ksztalcie, oraz Familie rodowitej Slachty Polskiej, i W.X.Litewskiego, z ich herbami. T.I.Cz. I. – Warszawa, 1972.–S. 2 – 3.
11. *Бубенька Т.С., Хмяльніцкая Л.У.* Кафля з гербамі


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Агінскіх з Віцебска.//Гістарычна-археалагічны зборнік, 1994,.–№ 3.–С.116.
12. *Niesiecki K*. Herbarz Polski. T. VIII. – Lipsk, 1841.–S. 244.
13. *Boniecki A*. Herbarz Polski T.X. – Warszawa, 1907.– ml.20/
14. *Заяц Ю.А*. Заслаўская кафля. – Мн., 1997.–С. 33 – 34.
15 .*Бубенька Т.С., Хмяльніцкая Л.У*. Кафля з гербамі Агінскіх з Віцебска, с.116; *Niesiecki K*. Herbarz Polski. T.I. – Lipsk, 1839.–S.480.
16 .*Wolff J*. Kniaziowie Litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – Warszawa, 1895.–S. 481.
17. *Kojalowicz W.W*. Hwerbarz rycerstwa W.X.Litewskiego t.zw. Compendium. – Krakow, 1897.–S.263.
18. *Здановіч Н.І*., 1997. Полацкая кафля канца XVI – XVII стст.– С.105, мал.9.
19. *Niesiecki K*. Herbarz Polski. T.I.– S.188; *Насевіч В*. Полацкае ваяводства.//Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.5. – Мн., 1999. – С.524.
20. *Kojalowicz W.W*. Herbarz rycerstwa W.X. Litewskiego t. zw. Compendium.– S.263.
21. *Здановіч Н.І*., 1997. Полацкая кафля канца XVI – XVII стст., с.106.– Мал. 8: 3,4.
22. Тамсама.– С.106.
23 .*Boniecki A*. Poczet rodow w Wielkiem ksienstwie Litewskiem w XV i XVI wieku. – Warszawa, 1883.– S. 311.
24. *Niesiecki K*. Herbarz Polski. T. VIII.– S. 333.
25. ПГКМЗ, кп-7, № 3913/18, кп-15, № 156343 і інш.
26. Беларуская кафля – Мн., 1989. –Мал. 94 – 96; *Заяц Ю.А*. Заслаўская кафля. –Мн., 1997. –Мал. 10, 3; 13.
27. *Левко О.Н*. Витебские изразцы XVI – XVIII вв. – Мн., 1981.–Рис. 8, 12.
28. *Niesiecki K*. Herbarz Polski. T.X. – Lipsk, 1845.–S.169.
29. *Kojalowicz W.W*. 1897. Herbarz rycerstwa W. X.Litewskiego t.zw. Compendium.– S. 41.
30. *Niesiecki K*. Herbarz Polski. T.X.– S.169 – 174.
31. *Здановіч Н.І*. 1997. Полацкая кафля канца... – С.108.
32. ПГКМЗ, кп-8, № 4345/104.
33. *Kojalowicz W.W*. Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego t. zw. Compendium.– S. 251.
34. *Niesiecki K*. Herbarz Polski. T. VIII. – S. 321.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова